ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 20 (854) ● Чацвер, 15 чэрвеня 1972 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXV

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● Да 90-годдзя з дня нараджэння Георгія Дзімітрава ● Вынікі падводзіць сесія ● У нас у гасцях Маскоўскі дзяржаўны універсітэт імя М. В. Ламаносава ● Па слядах нашых выступленняў ● Спорт

ПА УНІВЕРСІТЭТУ

Трэці дзень працуе ва універсітэце арганізаваная па ініцыятыве інстытута АН БССР, матэматычнага інстытута імя Сцяклова АН СССР і савета маладых вучоных пры ЦК ЛКСМБ Усесаюзная школа па аналітычнай тэорыі лікаў. Лекцыі па сучасных праблемах тэорыі лікаў прадстаўнікам 16 гарадоў чытаюць буйнейшыя вучоныя краіны. Сярод іх: Брадзіхін (Куйбышаў), Ліннік (Ленінград), Карацуба (МДУ), Корабаў (МДУ), Лаўрык (Ташкент), Кубілюс (Вільнюс). Усяго у школе каля 60 слухачоў, у тым ліку і некалькі студэнтаў нашага універсітэта.

Вялікі ўдзел у падрыхтоўчай рабоце прымалі былыя выпускнікі нашага універсітэта В. Бернік, Э. Кавалеўская і С. Котаў.

***

Заканчваюцца уступныя экзамены на завочны факультэт. Адным яны прынеслі радасць, другім — расчараванне. Хто ж паступае да нас ва універсітэт?

Больш паловы паступаючых на біялагічны факультэт маюць працоўны стаж больш як 2 гады. 70 чалавек жывуць у сельскай мясцовасці. На геаграфічным факультэце таксама пераважаюць жыхары вёсак На юрыдычны факультэт ідуць людзі, якія ў сваёй большасці ўжо знаёмы з нялёгкай працай па ахове сацыялістычнай законнасці. Больш ста чалавек—члены і кандыдаты ў члены КПСС.

Амаль палова абітурыентаў, якія паступаюць на факультэт журналістыкі, працуюць у рэдакцыях газет. Многія маюць вялікі стаж работы.

І, як заўсёды, састаў абітурыентаў многанацыянальны.

***

На факультэтах ідуць сходы студэнцкіх будаўнічых атрадаў. Вырашаюцца апошнія пытанні. Сёння ўсе байцы СБА збяруцца разам у актавай зале галоўнага корпуса, каб пачуць шмат сяброўскіх парад, цёплых развітальных слоў. Перад байцамі выступіць рэктар універсітэта акадэмік А. Н. Сеўчанка.

ГАСПАДАРЫЦЬ СЕСІЯ

Студэнцкая пара экзаменаў — гэта найвышэйшае напружанне сіл, найбольшая інтэнсіўнасць працоўнага дня. Забываецца ўсё, што не адносіцца да сесіі, старанні накіраваны да адной мэты — паспяхова здаць яе.

Сёлета цэнтр цяжару ў рабоце па падрыхтоўцы да вясенняй сесіі быў перанесен у акадэмічны сектар. І дзейсную дапамогу студэнты атрымлівалі там, дзе камітэты камсамола факультэтаў строга планавалі сваю работу, кантралявалі своечасовае выкананне намечанага, г. зн. там, дзе ёсць асабістая адказнасць за даручаную справу. Асаблівай ўвагі ў гэтым плане заслугоўвае работа акадэмічнага сектара камітэта камсамола біялагічнага факультэта, за работу якога адказваюць Н. Макяёнак і Т. Голік.

На факультэце была створана акадэмічная камісія з 11 чалавек (такая ж камісія ёсць на матэматычным факультэце), куды ўвайшлі адказныя за акадэмічную работу ў камітэце камсамола, прафкоме, курсавых бюро. Дзейнасць яе загадзя планавалася на кожнае паўгоддзе, што павышала эфектыўнасць работы. Перыядычна камісія аналізавала бягучую паспяховасць, наведванне лекцый. А на пасяджэннях, улічваючы вынікі рэйдаў, распрацоўваліся перспектыўныя планы: адстаючых студэнтаў выклікалі на бюро курсаў, камітэта камсамола; атрымліваў аператыўную інфармацыю перыядычны друк факультэта, на дапамогу прыходзіў «Камсамольскі пражэктар», экстраныя выпускі «Маланкі».

У сваю чаргу камітэт камсамола ўстанавіў асабістую адказнасць за правядзенне падрыхтоўчай работы на курсах.

З падрыхтоўчым этапам работы паспяхова справіліся філалагічны, хімічны, юрыдычны факультэты, факультэт прыкладной матэматыкі. Тут былі арганізаваны дадатковыя лекцыі, кансультацыі, калёквіумы. Як станоўчы момант трэба адзначыць цесную сувязь акадэмічных сектараў з выкладчыкамі, дэканатамі, партарганізацыямі. Агульнымі намаганнямі былі вырашаны пытанні забеспячэння свабоднымі аўдыторыямі, правядзення кваліфікаваных кансультацый. Заслугоўвае ўвагі вопыт фізічнага, філалагічнага, біялагічнага факультэтаў, дзе арганізаваны стэнды ходу здачы сесіі (на факультэтах яны называюцца па-рознаму: філалагічны факультэт — «Бюлетэнь», біялагічны факультэт — «Табліца-зводка» і г. д. Несумненная эфектыўнасць гэтага пачынання. Перыядычна выпускаемая табліца-зводка на біялагічным факультэце была пераўтворана ў пастаянна дзейнічаючы орган — газету «Аб'ектыў», якая дазваляе камітэту камсамола кантраляваць не толькі здачу экзаменаў, але і прамежкавы перыяд—ад сесіі да сесіі. Гэта, у сваю чаргу, абумоўлівае правільную арганізацыю рабочага часу студэнта на працягу ўсяго года, раўнамернае размеркаванне ўвагі на ўсе вучэбныя дысцыпліны.

Падвядзенне вынікаў, заахвочванне найбольш паспяваючых мае вялікае значэнне. Калі студэнт адчувае ўвагу да сябе, да вынікаў асабістых намаганняў — гэта дысцыплінуе яго, прымушае шырэй глядзець на вучобу— не толькі як на «сваю», а і як на дзяржаўную справу. У гэтым аспекце дастойны пераймання вопыт акадэмічных сектараў юрыдычнага, філалагічнага, біялагічнага факультэтаў, дзе бацькам студэнтаў, актыўна ўдзельнічаючых у грамадскім жыцці факультэта, выдатна паспяваючых у вучобе, высылаюцца пісьмы-падзякі. Аб выхаваўчым значэнні гэтых пісем гаварыць не прыходзіцца.

Па выніках праводзімых спаборніцтваў адзначаюцца акадэмічныя групы, што вельмі важна. Бо несумненна тое, што дружным і згуртаваным калектывам можна дабіцца лепшых вынікаў, чым у адзіночку. Калектыў выхоўвае кожнага, узнімае да свайго ўзроўню. Акадэмічныя сектары павінны звярнуць асаблівую ўвагу на гэтую форму работы, прапагандаваць, шырока інфармаваць студэнтаў аб выніках спаборніцтваў і дасягнутых поспехах у акадэмічных групах. На жаль, не атрымаў дастатковай галоснасці вопыт работы другой групы IV курса юрфака, прызнанай лепшай па паспяховасці ў БДУ. Справа закончылася паездкай студэнтаў у Вільнюс, а перыядычны друк, акадэмічны сектар абмежаваліся маўчаннем.

Рашаючы задачу павышэння паспяховасці, акадэмічныя сектары ўдаскональваюць формы работы, шукаюць новыя. Так, на юрыдычным факультэце праводзяцца субяседаванні з першакурснікамі; на хімічным факультэце вызначаны грамадскія куратары.

Заклапочвае актывістаў забяспечанасць вучэбнай літаратурай. Надта вялікая колькасць згубленых кніг. У сярэднім з 20 кніг студэнт губляе 5. Яшчэ большая колькасць не вернутых бібліятэцы кніг. Гэтым вызначаецца фізічны факультэт (179 студэнтаў-запазычнікаў), гістарычны (63), геаграфічны (84). Некаторыя студэнты не здаюць вучэбную літаратуру з 1968, 1969 гадоў. Камітэты камсамола факультэтаў і іх акадэмічныя сектары павінны ў магчыма кароткія тэрміны прыняць меры, каб выправіць існуючае становішча. Бо з-за нядбайнасці, абыякавасці асобных студэнтаў астатнія пазбаўлены магчымасці азнаёміцца з неабходнай літаратурай.

Да недахопаў належыць аднесці палавінчатыя меры ў рабоце акадэмічных сектараў. Часта іх дзейнасць спыняецца на паўдарозе, не атрымліваюць завяршэння добрыя пачынанні. Пройдзе, напрыклад, спаборніцтва, падвядуць вынікі, а канкрэтныя меры для выпраўлення выяўленых памылак не прымаюцца. Нярэдка сектары працуюць ізалявана, не атрымліваюць дапамогі ад камітэта камсамола і іншых грамадскіх арганізацый факультэта, не адчуваюць іх кантролю. Часта акадэмічныя сектары складаюць перанасычаныя мерапрыемствамі планы, а камітэты камсамола зацвярджаюць іх. Потым частка мерапрыемстваў застаецца нерэалізаванай. Улічваючы гэта, камітэт камсамола павінен больш уважліва адносіцца да састаўлення перспектыўных планаў і больш строга кантраляваць іх выкананне.

У цэлым работа акадэмічнага сектара камітэта камсамола палепшылася, удасканалены формы і метады, якія садзейнічаюць паспяховасці студэнтаў. Аднак, улічваючы сучасныя задачы навучання, аб якіх гаварыў на Усесаюзным злёце студэнтаў Л. І. Брэжнеў, перад камітэтамі камсамола факультэтаў адкрываецца яшчэ больш шырокі і адказны фронт работ.

А. ШЧАРБІНА,
загадчык акадэмічнага сектара камітэта камсамола БДУ.

ВЫНІКІ АБНАДЗЕЙВАЮЦЬ

Цяжка сёння назваць галіну ведаў, вывучэннем якой займалася б больш людзей, чым эканамічнай навукай. Гэта тлумачыцца, з аднаго боку, узрастаючай роляй марксісцка-ленінскай тэорыі ў агульным працэсе пазнання навейшых з'яў грамадскага жыцця, а з другога, пастаяннымі клопатамі КПСС аб павышэнні ўзроўню эканамічнай адукацыі савецкіх людзей.

Вялікая работа па павышэнню эканамічнай адукацыі маладых спецыялістаў праводзіцца ў апошні час і на біяфаку. Асабліва ў гэта прыкметна ў бягучым навучальным годзе. Адміністрацыя, партыйнае бюро, камітэт камсамола дабіліся рэгулярнага і амаль стопрацэнтнага наведвання студэнтамі лекцый і семінараў па палітычнай эканоміі. Павысілася якасць лекцый, палепшана методыка правядзення семінараў. Актывізавалася самастойная праца студэнтаў над рэкамендаванымі праграмай курса першакрыніцамі. Вынікі гэтай працы знайшлі адлюстраванне ў гадавых ацэнках і асабліва ў курсавых экзаменах. Так, студэнты III курса пятай групы здалі 8 чэрвеня экзамен па палітычнай эканоміі капіталізму толькі на добра і выдатна.

Асабліва змястоўнымі, з элементамі самастойнасці ў меркаваннях былі адказы Н. Чарвяковай, Т. Смірновай, Т. Голік, Е. Кушнер. На гэтых студэнтаў варта раўняцца астатнім. Аб тым, што такое раўненне правамоцнае, гавораць станоўчыя вынікі бягучай паспяховасці па гэтай дысцыпліне ў I, II, III, IV групах курса.

Задача цяпер заключаецца ў тым, каб гэтыя вынікі не толькі пацвердзіць на экзаменах, але і значна палепшыць.

Што датычыцца адміністрацыі факультэта, то, як нам думаецца, напрамак работы, якая садзейнічае павышэнню ўзроўню эканамічнай адукацыі маладых спецыялістаў, трэба развіваць і надалей з тым, каб да канца выканаць задачу, пастаўленую XXIV з'ездам нашай партыі,— «павышаць якасць падрыхтоўкі і паляпшаць ідэйна-палітычнае выхаванне будучых спецыялістаў».

С. ЛУКАШЭВІЧ,
дацэнт.

18 ЧЭРВЕНЯ СПАЎНЯЕЦЦА 90 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Г. ДЗІМІТРАВА

ХРОНІКА ПАДЗЕЙ

● Рыхтуючыся адзначыць 90-годдзе з дня нараджэння мужнага рэвалюцыянера, бясстрашнага барацьбіта супраць фашызму, віднага дзяржаўнага дзеяча Георгія Дзімітрава, аддзяленне таварыства савецка-балгарскай дружбы БДУ правяло рад мерапрыемстваў. З лекцыяй аб жыцці і дзейнасці вялікага сына балгарскага народа выступіў дацэнт Д. Б. Мельцар. Адбылася навуковая канферэнцыя, у якой прынялі ўдзел савецкія і балгарскія студэнты. Аб Георгію Дзімітраве, стваральніку балгарскай сацыялістычнай дзяржавы, расказала студэнтка першага курса ФПМ Сняжына Мановава. Студэнты гістарычнага факультэта Н. Гаўрылюк, Л. Жыхарава, О. Яноўскі прысвяцілі свае даклады важнейшым этапам жыцця і дзейнасці Г. Дзімітрава.

● Вялікую цікавасць выклікаюць арганізаваныя ва універсітэце юбілейныя фотавыстаўкі.

● У аўдыторыі савецка-балгарскай дружбы адкрыта кніжная выстаўка, на якой прадстаўлены творы Г. Дзімітрава, кнігі аб ім.

● Сотні студэнтаў БДУ паглядзелі балгарскі кінафільм «Пажар», які расказвае аб сутычцы Г. Дзімітрава з фашызмам на Лейпцыгскім працэсе.

● У гэтыя перадюбілейныя дні асаблівую цікавасць да матэрыялаў аб жыцці і дзейнасці вялікага сына балгарскага народа праяўляюць удзельнікі будаўнічага атрада, які хутка накіруецца ў НРБ, а таксама практыканты, чыя стажыроўка пройдзе ў брацкай Балгарыі.

СССР 50

СЁННЯ Ў НАС У ГАСЦЯХ МАСКОЎСКІ ОРДЭНА ЛЕНІНА І ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ М. В. ЛАМАНОСАВА.

Московский университет

У адной з чытальных залаў бібліятэкі ў новым гуманітарным корпусе.

Фота *В. Лапкіна.*



«ВІВАТ, АКАДЭМІЯ!»

Вясной 1968 года на шчытах сухой тынкоўкі, закрываўшых праём варот аднаго з нічым, здавалася б, не прыкметных будынкаў, звернутых фасадам да сквера на плошчы Рэвалюцыі, з'явіўся размашыста напісаны мелам надпіс: «Славяна-грэка-лацінская акадэмія—тут. Віват, акадэмія! Шэфы — студэнты МДУ». Праз тры дні надпіс паспрабавалі сцерці. Ён не паддаўся. Тады вароты забілі шчытамі яшчэ раз—поверх ранейшых. Але работа студэнтаў МДУ, упершыню адкрыўшых для сябе месцазнаходжанне вядомай Акадэміі, а галоўнае, яе рэальна захаваныя старажытныя будынкі, працягвалася.

Пачалася яна з нядзельнікаў па расчыстцы вузкага двара паміж храмам і рызніцай Заіконаспаскага манастыра, у якім размяшчалася Акадэмія, і яе Настаўніцкім корпусам — былымі брацкімі келлямі таго ж манастыра. Пачаліся пробныя раскопкі ў падклеці былой Акадэмічнай царквы — галоўнага манастырскага храма. Яны далі цікавы матэрыял, які дазволіў высветліць некаторыя старонкі гісторыі гэтага да канца даследаванага помніка, пабачыўшага на сваім вяку Сімеона Полацкага, Карыона Істоміна, Анціоха Канцеміра, Васіля Трэдзіякоўскага, Сцяпана Крашаніннікава, Міхаіла Ламаносава і іншых вядомых дзеячоў рускай культуры XVII—XVIII ст. З гэтых сцен выйшлі першыя прафесары і частка першых студэнтаў Маскоўскага універсітэта.

Барацьба за выратаванне помніка цягнулася на працягу трох год. Была вынесена прапанова — арганізаваць тут Музей гісторыі рускай асветы. У Доме культуры гуманітарных факультэтаў адбыўся вечар, прысвечаны Славяна-грэка-лацінскай акадэміі, збіраліся матэрыялы па гісторыі Акадэміі. Акрамя універсітэцкіх філолагаў, гісторыкаў, журналістаў і фізікаў, уключыліся ў работу студэнты Гісторыка-архіўнага інстытута.

І вось Масгарвыканком 12 мая 1971 года перадаў былы Настаўніцкі корпус Акадэміі Гісторыка-архіўнаму інстытуту для выкарыстання ў вучэбных мэтах. Інстытут, са свайго боку, узяў абавязацельства арганізаваць у трапезнай палаце (пасля яе рэстаўрацыі) экспазіцыю па гісторыі Акадэміі, па гісторыі рускай культуры і асветы XVII—XVIII ст.

Цяпер справа за намі. Работа толькі пачалася, і зрабіць прадстаіць вельмі многа. Знявечаная трапезная завалена бітай цэглай. Каб скласці праект яе рэстаўрацыі, неабходна ачысціць інтэр'ер і вонкавыя сцены, выявіць старажытныя праёмы, зняць насланую пазней падлогу.

Толькі тады, адначасова з праектам рэстаўрацыі, можна будзе рабіць і праект экспазіцыі. Якой яна павінна быць? Як зрабіць, каб яна была цікавай? Якія матэрыялы выстаўляць? Дзе іх браць? Дзе, у якіх сховішчах захоўваюцца свабодныя экземпляры старажытных чарнілиц, пясочніц, пер'яў, сшыткаў, кніг, гравюр, вучэбных дапаможнікаў?

Варта падумаць і аб знешнім афармленні будынка, які знаходзіцца на месцы найбольшага скаплення масквічоў і прыезджых.

Акрамя стварэння экспазіцыі і падрыхтоўкі лектараў і экскурсаводаў для яе, прадстаіць нямала важных спраў.

Будынкі Акадэміі—помнікі архітэктуры дзяржаўнага значэння — павінны, нарэшце, атрымаць свае ахоўна-мемарыяльныя дошкі, якія ўказваюць на іх месца ў гісторыі рускага дойлідства.

Трэба выдаць буклет па Славяна - грэка-л а ц і нскай акадэміі, апублікаваць зборнік артыкулаў, прысвечаных Маскоўскай Акадэміі і яе выдатным выхаванцам, адыграўшым вялікую ролю ў развіцці рускай культуры і асветы XVII—XVIII стагоддзяў.

Усё гэта яшчэ наперадзе. І здзяйсненне гэтага — справа гонару філолагаў і гісторыкаў МДУ, студэнтаў Гісторыка-архіўнага інстытута, узяўшых на сябе вясной 1968 года ганаровую і адказную ролю—быць шэфамі незаслужана забытай Славяна-грэка-лацінскай акадэміі —dema mater рускай асветы.

А. КЛІМЕНКА,
выпускнік МДУ.

АДКРЫЦЦЁ НАРАДЖАЕЦЦА Ў МДУ

Ўплыў святла на розныя арганізмы... У апошнія гады гэта праблема выклікае ў многіх даследчыкаў асаблівую цікавасць. Некалькі год вырашала яе і група вучоных нашага універсітэта. Аб выніках мы папрасілі расказаць сёння старшага навуковага супрацоўніка фізічнага факультэта Леаніда Барысавіча РУБІНА.

— Ужо дасягнуты значныя поспехі ў вывучэнні фотасінтэзу, зроку і іншых фотабіялагічных працэсаў. Можна лічыць устаноўленым, што усе зялёныя расліны і водарасці характарызуюцца наяўнасцю спецыяльных фотарэгулятарных сістэм, якія аказваюць глыбокі ўплыў на іх абмен рэчываў. А вось што датычыцца шырокай групы няфотасінтэзуючых мікраарганізмаў, то аж да нашага часу ў літаратуры адсутнічалі даныя аб уплыве на іх святла.

У выніку шматгадовай напружанай працы, што праводзілася ў МДУ, удалося даказаць факт існавання такіх сістэм і ў няфотасінтэзуючых мікраарганізмаў.

Паспяховае рашэнне гэтай праблемы мае вялікае значэнне як у тэарэтычных, так і ў практычных адносінах. Атрыманыя вынікі могуць знайсці шырокае прымяненне ў новай бурна растучай галіне народнай гаспадаркі— мікрабіялагічнай прамысловасці.

У працэсе даследчай работы была зроблена вялікая колькасць эксперыментаў. Можна прывесці хоць бы такі прыклад — на працягу першых двух год даследавання не ўдалося атрымаць ні аднаго абнадзейваючага выніку! Аднак гэтыя гады не прайшлі дарэмна. Яны заклалі той падмурак, на якім цяпер грунтуюцца ўсе даследаванні.

Цяпер па выніках работ выдадзены два аўтарскія пасведчанні і прыняты рашэнні аб іх патэнтаванні ў ЗША, ФРГ, Швецыі, Англіі, Францыі і Японіі.

Атрыманыя вынікі — гэта першыя звесткі ў даволі перспектыўных даследаваннях.

Якія прычыны абумовілі поспех маладога даследчага калектыву? У першую чаргу — спалучэнне вялікага вопыту вучоных-кансультантаў прафесара Е. Н. Кандрацьевай і члена-карэспандэнта АН СССР прафесара Р. В. Хахлова і маладосці, настойлівасці студэнтаў, аспірантаў і супрацоўнікаў праблемнай лабараторыі касмічнай біялогіі біёлага-глебавага факультэта, кіруемай доктарам навук А. Б. Рубіным, і кафедры хвалевых працэсаў фізічнага факультэта — О. В. Ерамеевай, Г. Я. Фрайкіна, Ю. Э. Швінка, Н. П. Адамавай. У рашэнні гэтай праблемы прымаюць удзел спецыялісты розных профіляў: біяфізікі, мікрабіёлагі, фізікі-оптыкі, фотахімікі, аб'яднаныя міжфакультэцкім саветам па біяфатоніцы.

●●●

За трынаццаць год існавання будаўнічых атрадаў МДУ у іх прынялі ўдзел каля 29,5 тысячы студэнтаў. Імі было асвоена 46,5 мільёна рублёў капіталаўкладанняў.

На здымку: байцы СБА перад ад'ездам на летнія работы.

Фота **С. Саўкіна.**

●●●

СУМЕСНАЯ МАНАГРАФІЯ

У Берліне выдадзена на нямецкай мове калектыўная манаграфія «Эканамічнае стымуляванне сацыялістычнай вытворчасці». Аўтары кнігі—вучоныя эканамічнага факультэта МДУ і вышэйшых навучальных устаноў ГДР. З савецкага боку ў рабоце над манаграфіяй прымалі ўдзел прафесары С. Татур, М. Асадзька, Н. Спірыдонава, дацэнты Г. Елізаран, І. Ляўчук, В. Карачкін, В. Рыбін, Н. Шэхет і І. Шылін.

У кнізе разглядаюцца агульныя тэарэтычныя праблемы эканамічнага стымулявання ў сацыялістычнай гаспадарцы. Важнае месца адводзіцца пытанням свядомага выкарыстання эканамічных законаў у практыцы сацыялістычнага гаспадарання, высвятленню ролі і месца гаспадарчага разліку ў сістэме вытворчых адносін сацыялізму.

Уяўляе інтарэс асвятленне тэарэтычных і практычных пытанняў, звязаных са здзяйсненнем у СССР і ГДР новай сістэмы планавання і эканамічнага стымулявання.



Галоўны гадзіннік універсітэта.

КУРСЫ ДЛЯ ЎСХОДАЗНАЎЦАЎ

У Інстытуце усходніх моў пачаў працаваць факультэт павышэння кваліфікацыі па спецыяльнасці «Гісторыя краін Азіі і Афрыкі». На факультэце займаюцца выкладчыкі універсітэтаў і педагагічных інстытутаў, якія чытаюць курсы па гісторыі Усходу.

Да нас прыехалі прадстаўнікі Далёкаўсходняга, Саратаўскага, Мардоўскага і Малдаўскага універсітэтаў.

Курс павышэння кваліфікацыі прадугледжвае чытанне лекцый і правядзенне семінараў па асноўных праблемах гісторыі краін Азіі і Афрыкі ў сярэднія вякі, у новы і навейшы час. Асаблівая ўвага звернута на асвятленне сучаснага становішча вывучаемых краін і агульных праблем сацыяльна-эканамічнага і ідэалагічнага развіцця. Натуральна, што ўпор пры гэтым робіцца на найбольш актуальныя пытанні і навейшыя дасягненні савецкай і сусветнай гістарычнай навукі. Значная ўвага ўдзяляецца і гісторыяграфіі.

Заняткі праводзяць вядучыя спецыялісты Інстытута ўсходніх моў і інстытута АН СССР. Слухачам прадастаўляецца магчымасць пашырыць свае пазнанні па культуры і мастацтву з дапамогай навуковых супрацоўнікаў музея ўсходніх культур, дзе арганізаван курс лекцый па мастацтву асобных краін Усходу.

Мяркуецца ўдзел слухачоў у рабоце метадалагічных семінараў і ў навуковых дыскусіях, праводзімых у ІУМ і ў інстытутах АН СССР. Слухачы наведваюць лекцыі выкладчыкаў ІУМ, атрымліваюць кансультацыі па гісторыі і ўсходніх мовах. Напрыклад, слухач Ф. І. Каражыя займаецца турэцкай мовай, карэіст В. М. Сяроў атрымлівае кансультацыі ў прафесара М. Н. Пака, бірманістка Л. Н. Жураўлёва рэгулярна прысутнічае пры навуковых абмеркаваннях, праводзімых аддзелам Паўднёва-Усходняй Азіі Інстытута ўсходазнаўства АН СССР.

Надзвычай важная для слухачоў работа па індывідуальнаму плану ў бібліятэках і архівах Масквы. Індывідуальныя планы прадугледжваюць паглыбленне ведаў і збор дадатковага матэрыялу па чытаемых курсах, падрыхтоўку артыкулаў і дысертацый. Многія з вялікай цікавасцю аднесліся да прапанаванай ім праграмы, акуратна наведваюць усе віды заняткаў і не ігнаруюць ні адной магчымасці пашырыць свае пазнанні.

Е. МЯДЗВЕДЗЕЎ,
дацэнт.

30 МІЛЬ АД БЕРАГА

У жніўні 1971 года на борце навукова-даследчага судна «Маскоўскі універсітэт» на Чорным моры працаваў атрад комплекснай геафізічнай экспедыцыі фізічнага факультэта. У саставе атрада—студэнты і супрацоўнікі кафедры фізікі мора і вод сушы. Наш няштатны карэспандэнт Н. Бодэ расказвае:

...Палуба, як распаленае жалеза. Толькі рэзкія крыкі чаек парушаюць спякотную цішыню. Ляжым у дрэйфе ў 30 мілях ад берага. Недалёка ад борта на трох белых паплаўках пакачваецца збудаванне, падобнае на вялікага камара — установка для вывучэння энергаабмену паміж морам і атмасферай. На самым судне днём і ноччу ідзе карпатлівая работа: самапісец фіксуе паказанні датчыкаў (падводных і атмасферных), ідзе апрацоўка інфармацыі.

А на глыбінях 20—25 метраў вывучаем прыдонныя цячэнні, упершыню зарэгістраваныя на Чорным моры нашымі вучонымі. Прыдонныя ўстаноўкі, створаныя супрацоўнікамі кафедры, фіксуюць напрамак і скорасць, турбулентнасць, пульсацыю тэмператур прыдонных цячэнняў.

Мэта даследаванняў — далейшае вывучэнне заканамернасцей працэсаў, якія адбываюцца ў водным асяроддзі і ўплываюць на дакладнасць доўгатэрміновага прагнозу надвор'я.

Вось яшчэ адна праблема. Плантацыі на дне акіяна, падводныя калгасы і рыбгасы — гэта пакуль яшчэ дзень заўтрашні. Каб ён наступіў, трэба здзейсніць работу такую ж вялікую, як і сам акіян. Падмурак для гэтай работы закладваюць фізікі, у тым ліку супрацоўнікі кафедры фізікі мора Маскоўскага універсітэта.

ЭКЗАМЕН НА ПЛАВЕ

На дызелі-электраходзе «Об», які вяртаўся на радзіму з Антарктыды, начпродам працаваў мурманчанін Алік Н. Рэйс праходзіў паспяхова, на харчаванне палярнікі не скардзіліся, і жыццё здавалася б начпроду цудоўным, калі б не адна акалічнасць: студэнт-завочнік, ён не паспеў на сушы здаць экзамен па палітычнай эканоміі. І калі з выпадковай размовы Алік даведаўся, што я па спецыяльнасці дыпламаваны выкладчык, у яго перахапіла дух...

Студэнт тут жа паімчаўся к першаму памочніку капітана Ткачову, той паслаў радыёграму ў Мурманск, і адтуль па эфіру прыйшоў адказ, які надзяліў выпускніка эканамічнага факультэта МДУ В. Саніна надзвычайнымі паўнамоцтвамі — правесці экзамен на плаве.

Трэба сказаць, што для гэтага свяшчэннадзеяння быў выбран не самы дабратворны момант: «Об» якраз праходзіў праліў Дрэйка, праслаўлены не толькі тым, што чатырыста год назад лёс закінуў сюды брыганціну вядомага пірата, але і сваімі штормамі. Дуў ураганны вецер. «Об» атакавалі хвалі вышынёй больш дзесяці метраў, а мы з Алікам сядзелі ў каюце, праўдзівей, з усіх сіл спрабавалі ўтрымацца на крэслах, якія рваліся ў прастору. Гэта было нялёгкай справай. Час ад часу нас кідала адзін аднаго ў абдымкі, а пасля аднаго ліхога штуршка Алік замест адказу на пытанне так сунуў мяне галавой у жывот, што любы паважаючы сябе экзаменатар без сумнення выгнаў бы студэнта з аўдыторыі.

...Я паставіў Аліку ўпаўне заслужаную чацвёрку, адпусціў яго і прапягваў займацца «акрабатыкай» у адзіноце.

Каб пазбегнуць крыватолкаў, прызнаюся, што за сваю працу я атрымаў сапраўды прафесарскі ганарар: баначку аўстралійскага піса, тут жа распітую экзаменатарам і студэнтам.

В. САНІН,
выпускнік эканамічнага факультэта, член Саюза пісьменнікаў СССР.

У ГАСЦЯХ «ЛЯ МЯЖЫ»

Неяк суботнім вечарам мне давялося позна затрымацца ва універсітэце. Выходзячы з галоўнага будынка, я раптам пачула, як аднекуль зверху льецца музыка. Мне стала нават сумна, што я іду дамоў, а там так весела і хораша. Пазней я даведалася, што па суботах на многіх факультэтах працуюць кафэ. І вось я пабывала на вечары ў адным са старэйшых і, як кажуць, адным з лепшых кафэ—«Ля мяжы» механіка - матэматычнага факультэта.

Студэнцкае кафэ існуе ўжо сем год. У многіх вну ўзнікалі падобныя кафэ, аднак існавалі яны нядоўга. У чым жа прычына поспеху гэтага кафэ?

Каб адказаць на гэтае пытанне, мне здаецца, трэба толькі адно—пабываць у ім.

Вось кафэ за 15 мінут да адкрыцця. Члены савета накрываюць на столікі. Шкада, што кава гатова вельмі рана... Ну, нічога. У другім канцы невялікай залы — таксама прыгатаванні. Сёння будуць выступаць рабяты з Інстытута усходніх моў. А ля ўваходу ў кафэ, як ля ўваходу ў тэатр, тоўпіцца народ і пытае лішні білецік. Трапіць сюды не зусім проста, бо факультэт вялікі, а кафэ невялікае. Можа ёсць сэнс знайсці іншае памяшканне—большае? Але мне пярэчаць:

— У вялікай зале цяжка стварыць такую ўтульнасць, як у нас.

І сапраўды, тут утульна: прыгожа афармленая зала, мяккі свет—усё гэта стварае добры настрой.

Але надышоў час, і кафэ адкрыта.

— Добры дзень, мы рады спяваць у вас!

І рабяты з ІУМ спяваюць аб прынцэсе, якая разам з прынцам адправілася на вярблюдзе ў падарожжа на Месяц, спяваюць песні докераў ЗША. Яны спяваюць, а ў холе хлопаюць у такт песні. Усё хутчэй, хутчэй.

Вось спявае Саша Елізараў. Ён вучыцца на чацвёртым курсе мехмата. І выступае не як госць, а неяк па-іншаму. Дзе вы бачылі, каб спевака проста прасілі:

— А праспявай, памятаеш, тую...

І яго просяць... Ён спявае розныя песні—вясёлыя і сумныя, спявае рамансы. Спявае так, нібы пра сябе расказвае...

У камітэце камсамола факультэта мне гаварылі, што, акрамя вечароў, арганізаваных клубам цікавых сустрэч і музычным клубам, у кафэ праводзяцца вечары патокаў. Да гэтых вечароў мастацкую самадзейнасць павінны рыхтаваць самі студэнты. Гэтае кафэ памятае і многіх гасцей — філалагічны факультэт, студыю эстрадных мініяцюр з педінстытута.

Першае аддзяленне закончана. У гранічна кароткі тэрмін зносяць столікі. І ўжо ўсіх чакае тая імклівая музыка, якая некалі здзівіла мяне.

Як бы ні была цікава задумана справа, яна не будзе выканана, калі хто-небудзь адзін не возьмецца ёю кіраваць, У кафэ механіка-матэматычнага факультэта такі чалавек — Леў Рыбалка. Разумееце, у яго ёсць сям'я, праца, а ён ужо тры гады кожную суботу праводзіць тут. Усе прыходзяць адпачываць, а Лёва—працаваць.

А што будзе, калі Лёва закончыць МДУ? Мне адказваюць, што ён сам выбера сабе пераемніка і яшчэ некаторы час будзе сачыць за работай кафэ.

Я выкажу не толькі сваю думку, калі скажу, што ў самой ідэі кафэ закладзена многа каштоўнага. Яно выхоўвае студэнтаў эстэтычна, але яшчэ і развівае пачуццё калектывізму. Калі я прыйшла ў кафэ і ўбачыла, як яно жыве, мне міжволі захацелася стаць часткай гэтага калектыву.

Агляд мастацкай самадзейнасці. Выступаюць студэнты факультэта журналістыкі. Фота **В. Міцькоўскага.**

Адзін з лепшых студэнтаў гістфака Аляксандр ГЕЙ.

ЧАКАЕ ДОМ КУЛЬТУРЫ

Павышаць ідэйна-мастацкі ўзровень праграм творчых калектываў, выкарыстоўваць усе формы прыцягнення студэнтаў у творчыя калектывы, зрабіць іх студэнцкімі — такую задачу паставілі мы перад сабой.

Адмовіўшыся ад метадаў работы на «спажыванне», мы імкнемся наладжваць дзейнасць ДК, грунтуючыся на выхаваўчых планах партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый факультэтаў.

Разам з факультэтам журналістыкі ў апошні час праведзены сустрэчы з дэлегатамі XXIV з'езда КПСС, вечары пасвячэння ў журналісты, «Спартыўная лятучка», разгорнута фотавыстаўка, якая адлюстроўвае навучальны працэс, творчасць і адпачынак студэнтаў.

Тэматычныя вечары пад дэвізам «Народ і армія —адзіны!» праводзяцца сумесна з ваеннай кафедрай гуманітарных факультэтаў. Студэнцкая аўдыторыя сустракаецца з праслаўленымі воінамі Савецкай Арміі. Гасцямі на гэтых сустрэчах былі дэлегат XXIV з'езда КПСС генерал арміі С. М. Штэменка, маршал артылерыі Г. Ф. Адзінцоў.

Сектар мастацкай самадзейнасці многа зрабіў у гэтым годзе для прыцягнення студэнцкай моладзі ў творчыя калектывы Дома культуры. Да нас прыйшлі цэлыя калектывы: эстрадная студыя факультэта журналістыкі, калектывы маладзёжнага танца (эканамічны факультэт), народнага танца (філасофскі факультэт), эстрадны аркестр (юрыдычны факультэт). Усе яны паспяхова працуюць цяпер над новымі праграмамі да 50-годдзя СССР.

Такім чынам, напрамак, узяты намі, аказаўся правільным. Дом культуры ўсё ў большай ступені становіцца студэнцкім, такім, якім ён і павінен быць. Справа гэта нялёгкая, і мы спадзяемся на цеснае супрацоўніцтва і дапамогу прафсаюза і камсамольскай арганізацыі універсітэта.

Р. ТРАЯНОЎСКІ,
дырэктар ДК гуманітарных факультэтаў.

Ручны мяч—гульня нашага імклівага веку. Універсітэцкія спартсмены ў гэтай гульні не з апошніх. Жаночая зборная ўдзельнічала ў першынстве СССР, была неаднаразовым чэмпіёнам спартакіяды вну Масквы. Мужчынская зборная таксама не раз займала прызавыя месцы ў гэтых спаборніцтвах.
Фота **П. Новікава.**

Да 90-годдзя з дня нараджэння Г. Дзімітрава

Адзначаючы 90-годдзе з дня нараджэння выдатнага дзеяча балгарскага і міжнароднага камуністычнага і рабочага руху, мы змяшчаем сёння матэрыял, прапанаваны рэдакцыі балгарскім студэнтам П. ДЗЕНЕВЫМ.

ВЯЛІКІ СЫН БАЛГАРСКАГА НАРОДА

У кожнага чалавека, выдатнага і звычайнага, свой лёс. Рознымі дарогамі вядзе ён чалавека па бясконцаму лабірынту жыцця, праз будні і святы, і так з калыскі да самага канца. Але дарогі аднекуль бяруць свой пачатак. Гэты пачатак з першых дзён асвятляе жыццё, вядзе да парога сталасці.

1904 год. Пачатак вялікага шляху! Малады член Балгарскай сацыял-дэмакратычнай партыі Георгій Дзімітраў прымае актыўны ўдзел ва ўсіх партыйных з'ездах. На працягу пэўнага часу ён з'яўляецца сакратаром Сафійскай партыйнай арганізацыі. А на Устаноўчым з'ездзе Усеагульнага рабочага прафесіянальнага саюза, які адбыўся ў тым жа годзе ў горадзе Плоўдзіве, Дзімітраў назаўсёды звязвае сваё жыццё з рабочым прафесіянальным рухам. Першыя крокі!

Калі возьмем карту Балгарыі і адзначым на ёй усе гарады і пасёлкі, якія наведаў і ў якіх выступаў Георгій Дзімітраў, мы пераканаемся ў тым, якую вялізную арганізатарскую і агітацыйную дзейнасць разгарнуў паўсюдна вялікі сын балгарскага народа. Кожны зручны момант ён выкарыстоўваў для растлумачэння становішча ў капіталістычнай Балгарыі, для арганізацыі рабочага класа. Нястомны агітатар і прамоўца, часта Дзімітраў у адзін і той жа дзень выступаў на некалькіх сходах. Паліцыя ідзе па слядах, але рабочыя чакаюць яго, дапамагаюць яму...

У рудніках і на фабрыках, сярод працоўных, на фронце сярод салдат Дзімітраў нясе жывое слова партыі, слова праўды і барацьбы. Ён любімы і жаданы прамоўца і агітатар усюды. У дні Лейпцыгскага працэсу словы Дзімітрава прабілі сцены імперскага суда і паляцелі па ўсяму свету. Яны праніклі ў самыя далёкія куткі зямлі, у сэрцы ўсіх сумленных і міралюбівых людзей.

Маабіцкая турма. Змрочны каменны калодзеж. Камера для самых небяспечных злачынцаў. Рукі Георгія Дзімітрава, вязня № 8085, закаваны ў кандалы. Цэлых пяць месяцаў яму даводзілася есці, спаць і пісаць у наручніках.

У Сафіі, Лондане, Парыжы, Белградзе, Нью-Йорку, Рыме і многіх іншых гарадах адзін за другім праводзіліся мітынгі ў абарону Дзімітрава і яго таварышаў. І ўвесь час сярод іншых галасоў моцна гучыць голас Савецкага Саюза.

21 верасня 1933 года ў зале імперскага суда ў Лейпцыгу пачалася вялікая бітва. З першай жа сустрэчы Дзімітрава з фашысцкім судом становіцца відавочным, хто пераможа.

16 снежня 1933 года — памятная дата. У гэты дзень Дзімітраў гаворыць сваю вядомую заключную прамову на Лейпцыгскім працэсе. Гэта дзень расплаты з абвінаваўцамі. Словы Дзімітрава гучаць па ўсяму свету. Свет узрушан, свет у захапленні!

«У мяне няма падстаў саромецца, што я балгарын. Я ганаруся тым, што я сын балгарскага рабочага класа...

Кола гісторыі круціцца, рухаецца наперад, у бок савецкай Еўропы, у бок сусветнага саюза савецкіх рэспублік, яно круціцца і будзе круціцца да канчатковай перамогі камунізму».

З трыбуны VII кангрэса Камінтэрна словы Дзімітрава даляцелі да ўсіх камуністаў ва ўсім свеце, да ўсіх антыфашыстаў, яны згуртоўвалі іх у барацьбе за абарону праў і свабод народаў.

Слухаючы і пазнаючы Дзімітрава, свет даведваўся аб маленькай Балгарыі, аб балгарскім народзе больш, чым з якіх-небудзь кніг і часопісаў.

Дзімітраў і Балгарыя, сын і радзіма-маці былі неаддзельныя.

Вялікі друг Савецкай краіны, Дзімітраў даваў наказ балгарскаму народу захоўваць гэтую дружбу як самы дарагі здабытак. І балгарскі народ імкнецца быць верным гэтаму вялікаму запавету.

П. ДЗЕНЕЎ,
студэнт I курса ФПМ.



Ва універсітэцкім двары. Фотаэцюд Д. ЧАХОВІЧА.

ТРАПНАЕ СЛОВА

— *Чым можна растлумачыць ваша даўгалецце?—спыталі Бернарда Шоу.*

— *Маім пахілым векам, — адказаў Шоу.*

Аднойчы рэгент запытаў у Фантэнэля, як лепш ацэньваць паэтычныя творы.

— *Ваша высокасць,—адказаў філосаф,—гаварыце пра іх, што яны ўсе дзянныя, і вы рызыкуеце памыліцца хіба што ў адным-двух выпадках са ста!*

На пачатку навуковай кар'еры Эйнштэйна адзін журналіст спытаў у яго жонкі, што яна думае пра свайго мужа.

— *Мой муж — геній!—сказала пані Эйнштэйн.—Ён умее рабіць усё, акрамя грошай.*

Эрнест Рэзерфорд карыстаўся такім крытэрыем пры выбары сваіх супрацоўнікаў. Калі да яго прыходзілі ўпершыню, Рэзерфорд даваў заданне. Калі пасля гэтага новы супрацоўнік пытаў, што рабіць далей, яго звальнялі.

— *Чаму гасподзь стварыў раней мужчыну, а толькі пасля жанчыну?— спытала адна дама ў Бернарда Шоу.*

— *Таму што ён не хацеў, каб у час стварэння мужчыны жанчына давала яму свае парады.*

Прафесар знаходзіць на сваім стале букет руж і здзіўлена пытае сваю жонку:

— *Што гэта за ўрачыстасць такая?*

— *А хіба ты не ведаеш? Сёння ж гадавіна твайго вяселля.*

— *Ах, як гэта міла!—ускліквае прафесар.—Калі будзе гадавіна твайго вяселля, нагадай мне, калі ласка, каб я купіў табе кветкі.*

ПАБЕРАЖЫЦЕ СВАЁ ЖЫЦЦЁ

Падыходзіць к канцу месячнік бяспекі руху. Дзякуючы агульным намаганням міліцыі і грамадскіх арганізацый, прыкметна палепшыўся парадак на нашых дарогах і вуліцах. Значна скарацілася колькасць парушэнняў і аўтатранспартных здарэнняў. Аднак няшчасныя выпадкі яшчэ маюць месца ў нашым горадзе. Так, нядаўна пры пераходзе вуліцы Свярдлова была збіта тралейбусам тэхнік геафізічнай экспедыцыі Л. Пятрэнка. Пацярпеўшая тут жа памерла. Цяпер ідзе следства, і мы не будзем апярэджваць падзеі, не будзем загадзя абвінавачваць вадзіцеля і апраўдваць пешахода. Скажам толькі, што нярэдка падобныя здарэнні адбываюцца па віне пешаходаў, з-за іх няўважлівасці на вуліцы, невыканання правіл руху.

А вуліца не церпіць такіх адносін да яе законаў. Цяпер, калі рух дасягае максімальнай інтэнсіўнасці, яна прад'яўляе асабліва высокія патрабаванні да пешаходаў.

На жаль, многія з іх не прытрымліваюцца гэтых патрабаванняў і вельмі часта бываюць пакараны за сваю бестурботнасць.

Нядаўна былі аштрафаваны за парушэнне правіл бяспекі руху студэнты БДУ Вячаслаў Лапіцкі (юрфак), Сяргей Ашчэпкаў і Валерый Марусенка, які былі п'яны; Аляксандр Міткавец, Валерый Мельнікаў, Алег Яноўскі (усе з гістфака).

Сёння вас аштрафавала міліцыя, а заўтра пры такіх абставінах вас пакарае сама вуліца. І больш сурова, чым інспектар ДАІ. Дык ці не лепш своечасова зрабіць адпаведныя вывады?

Р. АЎРАМЕНКА,
інструктар ДАІ УУС Мінгарвыканкома.

ХХ ЮБІЛЕЙНАЯ ФІНІШАВАЛА

Спорт

ХХ юбілейная спартакіяда універсітэта, прысвечаная 50-годдзю БДУ, фінішавала. Упэўнена і роўна выступілі зборныя каманды фізічнага факультэта па 11 відах спорту. Найбольшы поспех (I месца) заваявалі спартсмены фізфака па баскетболу (мужчыны), валейболу (мужчыны), спартыўнай гімнастыцы, стралковаму спорту, цяжкай атлетыцы.

Ля фінішу вынікі спартсменаў-фізікаў менш значныя: (шашкі — II месца, шахматы — IV). Відаць, дала адчуць сябе падрыхтоўка да сесіі.

А вось зборныя каманды факультэта прыкладной матэматыкі сабралі ўсе сілы для фінішнага рыўка. Паказчыкі гавораць самі за сябе: бокс — I месца, шашкі — I, шахматы — II. Гэтага ім хапіла для таго, каб выйграць спартакіяду.

Месцы размеркаваліся наступным чынам:

I — ФПМ, II — фізічны, III — гістарычны, IV — біялагічны, V — матэматычны, VI — юрыдычны, VII — геаграфічны, VIII — журналістыкі, IX — хімічны, X — філалагічны.

Паспяхова ў гэтым юбілейным годзе выступіў у праграме спартакіяды факультэт журналістыкі. Заслуга ў гэтым дэканата, партбюро, спортбюро, камітэта камсамола і адказнага за факультэт выкладчыка спорткафедры О. С. Сауніна. А вось аб хімічным факультэце гэтага не скажаш. Калі па выніках XIX спартакіяды хімікі занялі IV месца, то ў юбілейным годзе панізілі свае вынікі па 13 відах спорту.

Актыўны ўдзел нашых студэнтаў ва універсітэцкай спартакіядзе дазволіў укамплектаваць зборныя каманды БДУ па відах спорту мацнейшымі спартсменамі і падрыхтаваць іх для ўдзелу ў XV рэспубліканскай спартакіядзе вну СДСТ «Буравеснік».

Добра выступілі нашы зборныя па асобных відах спорту: баскетбол (жанчыны) — I месца, мужчыны — IV; біятлон — IV, класічная барацьба — III, цяжкая атлетыка — II месца.

Юбілейны год для студэнтаў-спартсменаў праходзіць пад дэвізам «50-годдзю СССР — дастойную сустрэчу!»

С. КАМІНСКІ,
старшыня спортклуба БДУ.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«КУРС ЛЕКЦЫЙ — МАСАВЫМ ТЫРАЖОМ»

Пытанні, узнятыя ў артыкуле «Курс лекцый — масавым тыражом» (газета № 8 ад 23.III.72 г.), вырашаюцца ў цэнтралізаваным парадку. Так, у апошнія 4—5 гадоў па асноўных геаграфічных дысцыплінах вядучымі выдавецтвамі краіны, у тым ліку і ў Беларусі, выдадзена падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў агульным тыражом звыш 500 тысяч экземпляраў.

Па дысцыплінах, якія ўпамінаюцца ў артыкуле, у цяперашні час маюцца падручнікі ў продажы ў кніжным кіёску універсітэта.

Адпаведна існуючаму палажэнню тыраж выданняў падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў устанаўліваюць кнігагандлёвыя арганізацыі.

У. ІВАШЫН,
прарэктар па вячэрняму і завочнаму навучанню, дацэнт.

«ЧАКАЕМ РАШЭННЯ»

Пад такім загалоўкам у газеце «Беларускі універсітэт» 23 сакавіка гэтага года быў змешчан артыкул, у якім расказвалася аб цяжкасцях у развіцці мастацкай самадзейнасці на факультэце прыкладной матэматыкі.

Як паведаміў старшыня праўлення клуба БДУ А. Фядотаў, па меры магчымасці праўленне клуба дапамагае факультэтам у набыцці музычных інструментаў (баянаў, акардэонаў) і касцюмаў. Але поўнасцю задаволіць запатрабаванні факультэтаў праўленне клуба не можа з-за абмежаванай матэрыяльнай базы. Таму факультэты павінны ставіць пытанне непасрэдна перад рэктаратам аб набыцці тых ці іншых інструментаў.

Кожны год у красавіку праводзіцца агляд мастацкай самадзейнасці факультэтаў. Да яго мастацкія калектывы павінны рыхтавацца з верасня, але некаторыя разлічваюць падрыхтавацца за месяц, а часам і за тыдзень. Так ствараюцца цяжкасці з рэпетыцыйнымі памяшканнямі, перад аглядам не ўсім факультэтам удаецца правесці рэпетыцыі ў актавай зале, ад чаго залежыць якасць канцэртных праграм факультэтаў.

У новым навучальным годзе калектывы агульнаўніверсітэцкай самадзейнасці будуць актыўна рыхтавацца да рэспубліканскага фестывалю мастацкай самадзейнасці Беларусі, прысвечанага 50-годдзю ўтварэння Саюза ССР. Хацелася б, каб у гэтую падрыхтоўку ўключыліся і калектывы факультэтаў.

Што ж датычыцца выкарыстання кіназалы і аўдыторыі № 8 геафака для рэпетыцый, то на гэта факультэт павінен атрымаць дазвол прарэктара па адміністрацыйна-гаспадарчай частцы.

Рэдактар
А. А. НІКОЛЕНКА.

АТ 02227
Заказ 701.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон—22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Тыраж 2 000 экз.